ляціць вечны час
праз нас -
і лічыць,
і лічыць,
як ісціну зычыць
на потым, каб вывесці з квоты
часовае ў нас
і нашае ў час,
і ніхто не адлучаны, ніхто не забыты,
нікога ні зводдаль, ні збоку -
тут усе застаемся мы ў цэнтры.

*Уладзімір Мархель*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Ларыса Іосіфаўна*
*Доўнар*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў
Бібліятэка

*Дзеячы навукі і культуры Беларусі*

# ЛАРЫСА ІОСІФАЎНА ДОЎНАР

Біябібліяграфічны даведнік

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2018

УДК 012 Доўнар Л. І.
ББК 91.28
Д 58

Складальнік *Т. А. Самайлюк*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Д 58 **Ларыса Іосіфаўна Доўнар** : біябібліягр. даведнік / склад. Т. А. Самайлюк ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, бібліятэка. – Мінск : БДУКМ, 2018. – 74 с. – (Дзеячы навукі і культуры Беларусі).
ISBN 978-985-522-207-2.

Біябібліяграфічны даведнік прысвечаны выбітнаму беларускаму вучонаму ў галіне бібліялогіі, кандыдату педагагічных навук, прафесару Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Ларысе Іосіфаўне Доўнар. Даведнік змяшчае працы Л. І. Доўнар з 1983 па верасень 2018 г., публікацыі пра яе творчы шлях.

Прапануецца навукоўцам і практыкам у галіне кнігазнаўства і гісторыі кнігі, выкладчыкам, студэнтам, аспірантам, бібліятэчным работнікам і ўсім, хто цікавіцца пытаннямі гісторыі і сучаснага стану кніжнай культуры Беларусі.

**УДК 012 Доўнар Л. І.**
**ББК 91.28**

**ISBN 978-985-522-207-2**

© Самайлюк Т. А., складанне, 2018
© Афармленне. Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», 2018

# ЗМЕСТ

Ад складальніка........................................................................ 6

Кшыштаф Міганьь. Ларыса Доўнар – выбітны беларускі бібліёграф і бібліёлаг........................................................................ 8

Пра Ларысу Доўнар........................................................................ 14

Бібліяграфічны спіс арыгінальных прац і прац пад навуковай рэдакцыяй Ларысы Доўнар........................................................................ 16

Алфавітны паказальнік загалоўкаў прац Ларысы Доўнар ... 58

Паказальнік прац, перакладзеных Ларысай Доўнар ............ 67

Паказальнік прац, рэцэнзаваных Ларысай Доўнар .............. 68

Імянны паказальнік ........................................................................ 69

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Біябібліяграфічны даведнік з серыі «Дзеячы навукі і культуры Беларусі» прысвечаны выбітнаму беларускаму вучонаму ў галіне бібліялогіі, кандыдату педагагічных навук, прафесару кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Ларысе Іосіфаўне Доўнар.

Творчая і прафесійная дзейнасць Л. І. Доўнар шматгранная і мае сваю гісторыю, якая знайшла адлюстраванне ў дадзеным даведніку. Адзначым толькі, што пасля вучобы ў Мінскім інстытуце культуры ў 1978–1982 гг. яна засталася вернай бібліятэчнай прафесіі і сваёй alma-mater: працавала бібліятэкарам, рэдактарам, метадыстам, загадчыкам аддзела абслугоўвання, развівала дзейнасць аддзела рэдкай кнігі, а таксама выконвала грамадскія абавязкі кіраўніка Прэс-цэнтра ўніверсітэта ў 1997–2007 гг. У 2007 г. яна стала перайшла на выкладчыцкую працу – на кафедру тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый, пасля рэарганізацыі якой, з 2017 навучальнага года – на кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

У артыкуле доктара габілітаванага тэорыі і гісторыі навукі пра кнігу, прафесара Вроцлаўскага ўніверсітэта Кшыштафа Міганя «*Ларыса Доўнар – выбітны беларускі бібліёграф і бібліёлаг*» характарызуецца яе творчы шлях, аналізуюцца навуковыя погляды. Дапаўняе артыкул рубрыка «Пра Ларысу Доўнар».

У раздзеле «Бібліяграфічны спіс арыгінальных прац і прац пад навуковай рэдакцыяй Ларысы Доўнар» змешчаны работы аўтара з 1983 па верасень 2018 г. Бібліяграфічныя запісы групуюцца па храналогіі, а ў межах года – па відах дакументаў (дакументы аднаго віду – у алфавіце) па наступнай схеме:

– кнігі і брашуры;

– артыкулы з неперыядычных выданняў і выданняў, што прадаўжаюцца (у тым ліку з электронных);

– артыкулы з часопісаў, газет, даведачных выданняў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– працы, якія выйшлі ў суаўтарстве;

– выданні, складальнікам якіх зяўляецца дзеяч (у тым ліку праграмы курсаў і метадычныя матэрыялы);

– выданні на замежных мовах.

Асобна выдзелены пераклады, рэцэнзаваныя працы і працы пад рэдакцыяй дзеяча.

Апісанні рэцэнзій на публікацыі Л. І. Доўнар змешчаны ў канцы апісанняў рэцэнзаваных твораў.

Бібліяграфічныя запісы ў даведніку складзены ў адпаведнасці з міждзяржаўнымі стандартамі ГОСТ 7.1-2003 «Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требования и правила составления», ГОСТ 7.80-2000 «Библиографическая запись. Заголовок. Общие требования и правила составления». У раздзеле «Бібліяграфічны спіс арыгінальных прац і прац пад навуковай рэдакцыяй» загаловак апісання не выкарыстоўваецца. Скарачэнні слоў і словазлучэнняў адпавядаюць патрабаванням дзяржаўнага стандарту Рэспублікі Беларусь СТБ 7.12-2001 «Бібліяграфічны запіс. Скарачэнне слоў і словазлучэнняў на беларускай мове. Агульныя патрабаванні і правілы» і міждзяржаўнага стандарту ГОСТ 7.12-93 «Библиографическая запись. Сокращение слов на русском языке. Общие требования и правила».

Навукова-дапаможны апарат выдання ўключае:

– алфавітны паказальнік загалоўкаў прац Ларысы Доўнар;

– паказальнік прац, перакладзеных Ларысай Доўнар (пераклады з польскай і рускай моў на беларускую);

– паказальнік прац, рэцэнзаваных Ларысай Доўнар;

– імянны паказальнік (аўтараў і суаўтараў публікацый, персаналій). Нумары бібліяграфічных запісаў персаналій у імянным паказальніку пазначаны ў дужках.

Даведнік не прэтэндуе на вычарпальную паўнату. Любыя папраўкі, дапаўненні і крытычныя заўвагі будуць прыняты з вялікай удзячнасцю.

Публікацыі, уключаныя ў даведнік, правераны de visu.

Адбор матэрыялаў закончаны ў верасні 2018 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛАРЫСА ДОЎНАР – ВЫБІТНЫ БЕЛАРУСКІ БІБЛІЁГРАФ І БІБЛІЁЛАГ

Ларыса Іосіфаўна Доўнар з 1982 г. – супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, спачатку бібліятэкар, цяпер (з 2014 г.) прафесар, добра вядома кнігазнаўцам Беларусі і Усходняй Еўропы сваімі публікацыямі па многіх пытаннях тэорыі і метадалогіі кнігазнаўства, гісторыі кнігі, бібліятэк і бібліяграфіі, па сучаснай выдавецкай справе, якія друкаваліся не толькі ў Беларусі, а таксама ў навуковых часопісах і зборніках у Літве, Польшчы, Расіі і Украіне на беларускай, рускай і польскай мовах. Яе навуковыя працы ахопліваюць важнейшыя пытанні кніжнай культуры ў цэлым: мінулае кніжнай культуры і яе сучасны стан.

Назіраючы за навуковай, дыдактычнай і публікацыйнай актыўнасцю Ларысы Доўнар, бачым багатыя, шматбаковыя і тэматычна разнастайныя дасягненні, якія ўжо трывала запісаліся ў беларускім кнігазнаўстве. Справіла гэта не толькі багацце публікацый, якія выходзяць з-пад яе пяра (і з-пад клавіятуры камп'ютара), але перад усім змест праблем, навізна паднятых пытанняў, якія неаднаразова ўпершыню з'яўляліся ў айчыннай кнігазнаўчай літаратуры. Выдатная падборка праблем, якія знаходзяцца ў русле кнігазнаўчых даследаванняў, узбагачаюць комплекс паняццяў, метадаў і праблематыку навукі пра кнігу ў розных планах – гістарычным, тэарэтычным, практычным. Розныя падыходы да даследчых задач кнігазнаўства і кніжнай справы дазваляюць аўтару ўводзіць новыя пункты гледжання і ў навуковую працу, і ў ажыццяўленне практычных задач кніжнай справы (у выдавецкай і бібліятэчнай, у бібліяграфіі, у статыстыцы друку).

У сваёй навуковай творчасці Ларыса Доўнар умела спалучае праблемныя, тэарэтычныя пытанні з фактаграфічнымі. Выказваючыся аб цэнтральных навуковых праблемах кнігазнаўства,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выводзіць іх з гістарычнага вопыту бібліёграфаў і бібліёлагаў як беларускіх, так і замежных. Іншымі словамі кажучы, будуючы сучасную навуку пра кнігу, паказваючы як ёй належыць займацца, рэспектуе кумулятыўны характар гуманітарнай дысцыпліны, якой з'яўляецца кнігазнаўства. Да існуючых навуковых дасягненняў навукі пра кнігу яна ўносіць зусім новыя элементы, прадастаўляе карысныя новыя канцэпцыі і метады даследавання, прапануе новае прачытанне даўніх біблiялагічных тэкстаў. Мае гэта фундаментальнае значэнне для пабудовы даследчай, тэарэтычнай і метадалагічнай базы развіцця беларускай навукі пра кнігу.

З канцэптуальнага боку вiдавочнай увагі кожнага, хто хоча гаварыць аб тэорыі і метадалогіі кнігазнаўчых даследаванняў, асабліва заслугоўваюць даследаванні і артыкулы, змешчаныя ў бібліяграфічным спісе дадзенага паказальніка пад нумарамі: *«Книжная культура как философско-культурологическая категория библиологии (к постановке проблемы)»* [146], *«Белорусская книга как универсум национальной культуры»* [152], *«Беларуская навука пра кнігу ў кантэксце персанальнага кнігазнаўства»* [200], *«Кніга і дакумент у кантэксце кагнітыўна-аксіялагічнага падыходу»* [213], *«Чытаючы бібліяграфічныя крыніцы па гісторыі кніжных сувязяў і кнігазбораў Беларусі XVIII – пачатку XX ст.»* [172], *«Книга и документ: “цена” вопроса»* [161], *«Открытые вопросы белорусского книговедения в контексте транслятологического опыта»* [240].

Напэўна не было б гэтых важных тэарэтычных выказванняў без значных дасягненняў аўтаркі на полі гісторыі кнігі ў Беларусі. Працы ў гэтай галіне як асноўныя часткі калектыўнай працы *«Кніжнасць новай Беларусі (XIX–XXI стст.)»* у фундаментальным выданні ў двух тамах пад рэдакцыяй М. В. Нікалаева *«Гісторыя беларускай кнігі»* (2011) і ўніверсітэцкі вучэбны дапаможнік *«Гісторыя беларускай кнігі»* (2012) – па сутнасці высакаякасны сінтэз, а таксама многія драбнейшыя публікацыі даводзяць, што Ларыса Доўнар не толькі дыспануе шырокай навуковай тэарэтычнай і метадалагічнай свядомасцю, ведамі, але ўмее адпаведна ўжываць патрабаванні даследаванняў гістарычна кнігазнаўчых у працах фактаграфічных.

Пазнаёміўшыся з працамі прафесара Ларысы Доўнар, я змог сфарміраваць уласны погляд і добра абгрунтаваць уяўленне аб вартасці (важнасці, каштоўнасці) і значэнні яе навуковых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дасягненняў. Бачу гэта як шматбаковае веданне традыцый кнігазнаўчых даследаванняў на тэрыторыі Беларусі, у асяроддзі беларускай дыяспары, а таксама ў суседніх краінах (Літва, Польшча, Расія, Украіна), якое дазволіла Ларысе Доўнар падняць нанова праблемы гісторыі беларускай навукі пра кнігу, яе айчынных і еўрапейскіх карэнняў, выклікала таксама патрэбу трактоўкі сінтэтычнага пытання «беларуская навука пра кнігу і яе перспектывы».

У сваю чаргу другі важны абшар гістарычна кнігазнаўчых даследаванняў, якому яна застаецца вернай не адно дзесяцігоддзе, па якім рухаецца са здзіўляючай паслядоўнасцю і настойлівасцю, прынёс у апошні час знакаміты вынік. Я маю на ўвазе паднятую ў кандыдацкай дысертацыі (абаронена ў 2005 г.) тэматыку *«Развіццё кнігавыдавецкай дзейнасці ў Мінску (1795–1917 гг.): кнігазнаўчы аспект»*, якая праз пэўны час прывяла да фундаментальнай манаграфіі «*Кніжная справа ў Мінску (канец XVIII – пачатак XX стагоддзя*» (2015). Значэнне гэтай новай працы выцякае з фундаментальных абавязкаў гістарычнага кнігазнаўства як навуковай дысцыпліны, якая вывучае поўную карціну кніжнай культуры ў адпаведных прасторавых і часавых межах. Важнасць такой тэмы не абмежавана задачамі гістарыяграфіі кнігі і кніжнай справы; яна ўваходзіць непасрэдна ў гістарычную навуку ў цэлым, у тым ліку ў гісторыю літаратуры і культуры, гістарычную этнаграфію, гісторыю моў. Манаграфія раскрывае мультыэтнічнае і поліглатычнае ці шматмоўнае вымярэнне выдавецкай прадукцыі даўняга Мінска.

Галоўнай мэтай даследавання было паказаць у адзінай сукупнасці ўсе важнейшыя сегменты мінскай кніжнай справы з канца XVIII да пачатку XX ст.: выдавецкая і друкарская справа, кніжны гандаль і бібліятэчныя зборы. Такі падыход да кніжнай спадчыны дае магчымасць выявіць новыя факты – састаўныя элементы кніжнай культуры, і на іх аснове будаваць абагульненні. Да гэтага часу названыя пытанні прадстаўляліся нібы ізалявана адно ад аднаго ці наогул не былі асветлены. Метадалагічны раздзел у пачатку манаграфіі «*Кніжная справа Мінска як аб'ект вывучэння ў кантэксце кнігазнаўчых даследаванняў»* выдатна прэзентуе пазіцыі аўтара і ўносіць новыя навуковыя катэгорыі ў даследаванні па гісторыі кніжнай культуры. Гэты ўступны раздзел прапаноўвае новы і яшчэ ў поўным выглядзе ў гіста-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рычным кнігазнаўстве не прыняты цэласны падыход да пытанняў кніжнай культуры. Ён можа таксама знайсці прымяненне ў даследаваннях кніжнай справы ў іншых гістарычных цэнтрах Беларусі, і – безумоўна – іншых краін.

Манаграфія Ларысы Доўнар складаецца з дзвюх аўтаномных, але цесна паміж сабой звязаных, частак: асноўнага тэксту і каталога мінскіх выданняў (3133 бібліяграфічныя адзінкі, у тым ліку больш за 600 новых). Такая канцэпцыя кампазіцыі манаграфіі для чытача-карыстальніка аптымальная. Тэкставая частка прыносіць арыгінальны гісторыка-кніжны матэрыял, прадстаўлены ў наступным парадку: кнігавыдавецкая дзейнасць, кніжны рэпертуар, кніжныя сувязі. У кожным з раздзелаў знаходзіцца багацце фактаў, якія падаюцца так, што ўжо адразу, у пачатку, і ў адпаведных назвах бачым галоўныя праблемы, якія раскрываюцца ў манаграфіі. Такім чынам, аналізу кнігавыдавецкай дзейнасці папярэднічае пытанне яе перыядызацыі, а прэзентацыя выдавецкіх фірм падаецца ў адпаведнасці з вылучанымі асноўнымі формамі ўласнасці (прыватныя, грамадскія, дзяржаўныя). Кніжны ж рэпертуар ахарактарызаваны па такіх прыметах, як змест (тэматыка), функцыянальнае назначэнне, мова і аўтарства выданняў. Прыцягваюць увагу «мінскія кніжныя рэдкасці», сярод якіх польскія музычныя выданні і характарыстыка рэпертуару яўрэйскіх выдавецтваў (бібліяграфічныя апісанні ў алфавіце іўрыт!). Затое раздзел «Кніжныя сувязі» ўключае, як даследчую задачу, не толькі непасрэдныя гандлёвыя кантакты «са сталіцамі» (Вільня, Варшава, Санкт-Пецярбург), але таксама мясцовы кніжны гандаль і мінскія кніжныя зборы. Такая аўтарская задумка добра ажыццяўляе Лавягінскую канцэпцыю «дынамікі кнігі», «кнігі ў дзеянні».

Значэнне манаграфіі Ларысы Доўнар павышае, звязаны з аповедам першай часткі, каталог мінскіх выданняў, карысны далёка за межамі кнігазнаўства як навукі. Улічваючы стан даследаванняў, ён з’яўляецца цяпер паўнейшым рэпертуарам мінскай кніжнай прадукцыі да 1917 г. і такім на многа гадоў застанецца. Высокая якасць навукова-бібліяграфічнай работы, прадуманая канцэпцыя каталога і скрупулёзная рэалізацыя дазволілі дасягнуць значнага выніку, які будзе ўзорам бібліяграфічнай эўрыстыкі і апрацоўкі кніжнага матэрыялу. Таксама статыстычныя звесткі, табліцы, графікі, ілюстрацыі, многія паказальнікі – увесь на-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вукова-дапаможны і даведачны апарат, падрыхтаваны аўтарам, з'яўляецца важным структурным звяном выдання, пацвярджае яго ранг манаграфіі.

Акрамя ўсіх адзначаных навуковых вартасцей, манаграфія мае і вялікае практычнае значэнне (асабліва для бібліяграфічнай і бібліятэчнай сфер) як крыніца ведаў пра кніжную справу ў Мінску і пра мінскія выданні. Значнасць даследавання вызначаецца і перспектывай новых распрацовак у галіне беларускай кнігазнаўчай адукацыі.

Ва ўводзінах да бібліяграфіі апублікаваных прац Ларысы Доўнар таксама нельга прапусціць некалькі заўваг аб характары і відавой спецыфіцы гэтай творчасці. Бібліяграфія сапраўды можа рэгістраваць усё што выдадзена (надрукавана ці апублікавана ў сетцы), але нават тады, калі бібліяграфія аднатавана, яна не ў стане паказаць поўнай даследчай актыўнасці, дыдактычнай або арганізацыйнай гэтага аўтара (пісьменніка, вучонага, грамадскага дзеяча). З прыроды рэчаў бібліяграфія, як правіла ці наогул, пазбягае ацэнкі; часта страчваючы на гэтым публікацыі да- і пасляканферэнцыйныя, паведамленні, агляды і рэцэнзіі, пераклады, рэдактарскую працу, друкі часовыя і мімалётныя, праграмы навучання, дакументаванне падзей грамадскіх або прыватных, невялікія камерцыйныя прадукты. У гэтым выпадку – бібліяграфічнага спіса прац Ларысы Доўнар – хацеў бы звярнуць увагу на немалую колькасць такіх публікацый, якія ў свеце ўніверсітэцкай навукі часта «не залічваюцца» да дасягненняў вучонага, нягледзячы на тое, што ў іх хаваюцца вялікія высілкі пазнавальныя, канцэпцыйныя, арганізацыйныя «аб'екту» персанальнай бібліяграфіі, а іх наяўнасць нярэдка змяшчае важны змест. У Ларысы Доўнар такімі з'яўляюцца ініцыяваныя ёй і рэдагаваныя з 2006 г. выпускі зборніка «*Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры*» (да сёння выйшла 7 тамоў), выступленні на канферэнцыях у Беларусі, Літве і Расіі, пераклады замежных тэкстаў на беларускую мову, каштоўныя і вельмі павучальныя рэцэнзіі (звяртаю ўвагу на прэзентацыю англамоўнай энцыклапедыі па гісторыі кнігі [239]). Аўтар гэтых слоў мае таксама даўгі ўдзячнасці адносна пані Прафесара за пераклад некалькіх артыкулаў, дзякуючы чаму яны трапілі да беларускага чытача; цяпер карыстаюся магчымасцю, каб афіцыйна і публічна за гэта падзякаваць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выказваю глыбокае перакананне, што падрыхтоўка і публікацыя бібліяграфіі напрацаванага Ларысай Доўнар з’яўляецца не толькі прызнаннем яе навуковых дасягненняў, але і задавальняе інфармацыйныя патрэбы цалкам немалой «бібліялагічнай аўдыторыі» – беларускай і замежнай.

*Кшыштаф Міганъ*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРА ЛАРЫСУ ДОЎНАР




**Самойлюк, Т.** Первые результаты / Т. Самойлюк // Современное слово. – 1997. – 20 февр. – С. 3. – *Пра Міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць». На фотаздымку: Л. Доўнар з Т. Дзем'яновіч, Т. Самайлюк і выдаўцом з «Асара» В. Сяргеюком.*

**Паўлаў, К**. Чытанні, прысвечаныя Аляксандру Ельскаму / Кастусь Паўлаў // Книжный мир. – 1999. – 3 июня. – *Л. Доўнар расказвае пра ўшанаванне памяці А. Ельскага.*

**Ладуцька, К.** Чытанні, прысвечаныя Аляксандру Ельскаму / Кастусь Ладуцька // Чырвоная змена. – 1999. – 3 чэрв. – *Л. Доўнар расказвае пра ўшанаванне памяці А. Ельскага.*

**Старасценка, У.** «Ельскі да Ельскага...» : *інтэрв'ю* з Л. Доўнар / Уладзімір Старасценка ; фота Т. Самайлюк // Культура. – 1999. – 6–12 лістап. – С. 12. – *Інтэрв'ю з Л. Доўнар пра «Універсітэты Ельскіх» і яго значэнне для беларускага і міжнароднага культурнага і навуковага жыцця.*

**Трусаў, А.** Універсітэты Ельскіх / Алег Трусаў, Марат Гаравы // Наша слова. – 1999. – 27 кастр. (№ 43). – С. 3. – *Узгадваецца*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*прапанова Л. Доўнар аб правядзенні мерапрыемстваў па ўшанаванні 165-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Ельскага.*

**Цітаўка, Г**. Вяртанне... магіл / Ганна Цітаўка ; фота А. Федарука // Чырвоная змена. – 1999. – 5 кастр. – *Аб ўдзеле Л. Доўнар у аднаўленні месца пахавання А. Ельскага.*

**Пясецкі, Я.** Мінуўшчыны прарочыя старонкі / Я. Пясецкі // Звязда. – 2001. – 16 чэрв. – С. 15. – *На здымку супрацоўнікі аддзела рэдкай кнігі БДУ культуры Л. Доўнар, Т. Дзем'яновіч, П. Бокач.*

**Русак, Н.** "Жыве кніга!" / Наталля Русак // kimpress.by : Электронны рэсурс. – 2007. – 27.04. – № 16 (782). – Рэжым доступу: http://kimpress.by/index.phtml?page=2&id=476&mode=print – Дата доступу: 15.03.2017. – *Пра Міжнародны беларуска-польскі навукова-практычны семінар «Кнігазнаўчыя даследаванні ў Беларусі і Польшчы: вопыт, арганізацыя, перспектывы», прымеркаваны да 490-годдзя беларускага кнігавыдання, які праходзіў 18 крас. у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. На фота Л. Доўнар.*

**«Нарадзіліся** на Стаўбцоўшчыне» : [у тым ліку пра Л. І. Доўнар] // Прамень. – 2008. – 5 сак., № 27 (8778) – С. 3. – (Дадатак да раздзелаў гісторыка-дакументальнай хронікі).

**Доўнар, Л. І.** Таямніцы з-пад даху / інтэрв'ю Дзяніса Марціновіча // Літаратура і мастацтва. – 2011. – 22 ліп. (№ 29). – С. 10.

**Доўнар, Л. І.** Публічнасць сямейнай шафы / інтэрв'ю Настассі Панкратавай // Культура. – Мінск, 2017. – 11 сак. (№ 10). – С. 14–15. – *Пра манаграфію «Кніжная справа ў Мінску (канец XVIII – пачатак XX стагоддзя)». Мінск : БДУКМ, 2015, прэзентацыя якой адбылася 24 лют. 2017 г. у бібліятэцы БДУКМ.*

**Капуста, Ж.** Шырэй за адну геаграфію і адну нацыю : [інтэрв'ю] / Жана Капуста // Літаратура і мастацтва. – 2017. – 23 чэрв. (№ 25). – С. 5. – *Пра манаграфію «Кніжная справа ў Мінску (канец XVIII – пачатак XX стагоддзя)». Мінск : БДУКМ, 2015.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС АРЫГІНАЛЬНЫХ ПРАЦ І ПРАЦ ПАД НАВУКОВАЙ РЭДАКЦЫЯЙ ЛАРЫСЫ ДОЎНАР

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 1983

1. **Мінскія** выданні ў XIX стагоддзі / Л. І. Мархель [Л. І. Доўнар] // Книга в Белоруссии: книговедение, источники, библиография : сб. статей / АН БССР, ЦНБ им. Якуба Коласа ; редкол.: Л. И. Збралевич, А. И Мальдис, В. И. Мархель, М. П. Стрижонок (отв.), И. А. Хацкевич. – Минск, 1983. – Вып. 2. – С. 17–28.

## 1992

2. **Успомнілі** Л. Геніюш / Л. І. Мархель [Л. І. Доўнар] // Літаратура і мастацтва. – 1992. – 5 чэрв. – С. 13. – *Пра літаратурны вечар, прысвечаны творчай спадчыне Ларысы Геніюш, у якім прымаў удзел пяцігадовы Ілья Доўнар і чытаў дзіцячыя вершы паэткі*.

## 1994

3. **З верай** і думай пра нашчадкаў... / Л. Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 1994. – 11 лістап. – С. 8. – *Пра кніжную калекцыю М. М. Грынчыка ў аддзеле рэдкай кнігі бібліятэкі БУК*.

## 1995

4. **Рупліўцы** культурнай спадчыны / Ларыса Доўнар // Минский меридиан. – 1995. – 15–21 дек. – *Пра прэзентацыю аддзела рэдкай кнігі ў бібліятэцы БУК*.

5. **У святле** кніжных скарбаў / Л. Доўнар // Минский меридиан. – 1995. – 6–12 окт. – С. 5. – *Да 20-годдзя бібліятэкі БУК*.

## 1996

6. **Мінскія** выданні XIX стагоддзя па гісторыі / Л. І. Доўнар // Наш Радавод : матэрыялы Міжнар. навук. канф. «Гістарычная памяць народаў Вялікага Княства Літоўскага і Беларусі, XIII–XX ст.» – Гродна : Зах.-Беларус. гуманітарны цэнтр даследаванняў Усходняй Еўропы, 1996. – Кн. 7. – С. 370–371.

7. **Даследавалася** недзяржаўнае кнігадрукаванне / Ларыса Доўнар // Кантакты і дыялогі. – 1996. – Лістап.-снеж. – С. 70–71.

8. **Дзялка** ў духоўнай спадчыне / Ларыса Доўнар // Минский меридиан. – 1996. – 7–14 мая. – *Пра культурна-асветныя мерапрыемствы, праведзеныя ў бібліятэцы БУК у лютым: прэзентацыя музея, прэзентацыя часопіса «Кстати», прэзентацыя кнігі Р. Шауры, прэзентацыя першага тома кнігі «Беларусы».*

9. **Роднаму** слову жыць вечна! / Л. Доўнар // Минский меридиан. – 1996. – 24–30 мая. – *Пра сустрэчу ў БУК з Нілам Гілевічам з нагоды выдання яго новай кнігі «Любоў прасветлая».*

10. **У полі** зроку – недзяржаўнае кнігадрукаванне / Ларыса Доўнар // Культура. – 1996. – 14 лістап. – С. 2. – *Пра канферэнцыю «Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць» (3–4 кастр. 1996 г.).*

11. **У полі** зроку – недзяржаўны кнігадрук / Ларыса Доўнар // Минский меридиан. – 1996. – 25–31 окт. – *Пра канферэнцыю «Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць» (3–4 кастр. 1996 г.).*

12. **Шчодры** на радасць люты / Ларыса Доўнар // Літаратура і мастацтва. –1996. – 15 сак. – С. 2. – *Падзеі ў лютым у БУК: адкрыццё музея, прэзентацыя кнігі Р. Шауры «Самадзейнае выяўленчае мастацтва Беларусі», прэзентацыя першага тома кнігі «Беларусы».*

13. **Якую** кнігу лічыць рэдкай? / Ларыса Доўнар // Голас Радзімы. – 1996. – 9 мая. – С. 6, 8. – *Пра асноўныя кірункі дзейнасці аддзела рэдкай кнігі бібліятэкі БУК, асноўныя калекцыі ў ім, дары ад Н. Гілевіча, А. Трусава, В. Скалабана, Г. Штыхава, У. Міхнюка і інш.*

14. **Дар** каштоўны, дар бясцэнны / Л. Доўнар, Т. Самайлюк // Культура. –1996. – 27 снеж. – 2 студз. – С. 6. – *Пра прэзентацыю аддзела рэдкай кнігі ў бібліятэцы БУК, пра калекцыі Г. Барышава і М. Грынчыка, дар А. Мальдзіса, НББ, ЦНБ НАНБ, ФБ БДУ, Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь і інш.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**1997**

15. **Да пытання** аб пачатку кнігадрукавання ў Мінску / Л. І. Доўнар // Культура Беларусі: спадчына і сучаснасць : тэз. дакл. на навук. канф. 18–19 крас. 1996 г.) / [рэдкал.: Я. Д. Грыгаровіч (адк. рэд.), Л. А. Дзямешка (нам. адк. рэд.), Н. А. Ляйко, А. У. Пазнякоў]. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1997. – С. 105–106.

16. **Крыніцазнаўчая** аснова гісторыі яўрэйскага кнігадрукавання XIX ст. у Мінску / Л. І. Доўнар // Евреи Беларуси. История и культура : сб. науч. трудов / Израильский культурно-информационный центр, Открытый Университет Израиля в Беларуси ; [ред. совет: И. Герасимова (отв. ред.), Е. Киммель, Г. Рутман]. – Мінск : Бестпринт, 1997. – Вып. 1. – С. 46–52.

17. **Прыватнае** кнігадрукаванне Мінска ў XIX стагоддзі / Л. Доўнар // Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – С. 18–20.

18. «**Ад маўчання** мне некуды дзецца»... / Л. Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 1997. – 3 кастр. – С. 8. – *Пра кнігу «На нашій, на своїй землі: Антологія різномовної поезії України» (Кн. 3. Київ, 1996), перададзеную ў аддзел рэдкай кнігі бібліятэкі БУК А. Трусавым.*

19. **Из истории** издательского дела в Белоруссии / Л. Довнар // Книжное дело. – Москва, 1997. – № 1. – С. 71–72.

20. **На нашій**, на своїй землі / Л. І. Доўнар // Кантакты і дыялогі. – 1997. – № 11–12. – С. 29–30. – *Пра кнігу «На нашій, на своїй землі : Антологія різномовної поезії України» (Кн. 3. Київ, 1996), перададзеную ў аддзел рэдкай кнігі бібліятэкі БУК А. Трусавым.*

21. **Беларускі** навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы : бібліягр. паказ. / БелНДІДАС, Бібліятэка Беларус. ун-та культуры ; склад.: Т. А. Самайлюк, В. У. Скалабан, Т. А. Дзем'яновіч, **Л. І. Доўнар**. – Мінск : БелНДІДАС, 1997. – 98 с.

22. **Інфармацыйны** бюлетэнь аддзела рэдкай кнігі / Беларус. ун-т культуры ; склад.: **Л. Доўнар**, Т. Дзем'яновіч, Т. Самайлюк. – Мінск, 1997. – 10 с. – *Першы выпуск інфармацыйнага бюлетэня прысвечаны «Калекцыі А. А. Трусава».*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

23. **Праблемы** недзяржаўнай выдавецкай дзейнасці на Беларусі / Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк // Культура Беларусі: спадчына і сучаснасць : тэз. дакл. на навук. канф. (18–19 крас. 1996 г.) / [рэдкал.: Я. Д. Грыгаровіч (адк. рэд.), Л. А. Дзямешка (нам. адк. рэд.), Н. А. Ляйко, А. У. Пазнякоў]. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1997. – С. 100–102.

24. **Рукапісныя** і друкаваныя кнігі беларускіх татараў : каталог выставы : (Да 600–годдзя татарскага асадніцтва на Беларусі) / БУК, бібліятэка, АРК ; уклад.: **Л. Доўнар,** Т. Самайлюк, Т. Дзем'яновіч ; кансульт.: Л. Станкевіч, І. Канапацкі. – Мінск : БУК, 1997. – 22 с., [27] с. іл.

***Рэдагаванне***

25. **Недзяржаўная** выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 3–4 кастр. 1996 г.) / Беларус. дзярж. ун-т культуры, фак. бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, бібліятэка, аддзел рэдкай кнігі, Беларус. бібліятэчная асацыяцыя ; [рэдкал.: Алег Трусаў, Тамара Самайлюк, Ларыса Доўнар, Таццяна Дзем'яновіч, Аляксандр Патупа, Яўген Будзінас, Наталля Бярозкіна]. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – 69, [3] с.

## 1998

26. **Мінскія** кнігазборы XIX стагоддзя / Л. І. Доўнар // Здабыткі : дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі ; склад.: Л. Г. Кірухіна, Т. І. Рошчына. – Мінск, 1998. – Вып. 3. – С. 60–72.

27. **Праблемы** вывучэння мінскай кнігі XIX ст. / Л. Доўнар // 480 год беларускага кнігадрукавання : матэрыялы Трэціх Скарынаўскіх чытанняў / [рэд.: Наталля Давыдзенка, Уладзімір Конан, Адам Мальдзіс (гал. рэд.)]. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – С. 232–236. – (Беларусіка = Albaruthenica ; кн. 9).

28. «**Баламуты»** з «Валачобнікамі» на каранаванні. Ва ўніверсітэце культуры / Ларыса Доўнар // Народная воля. – 1998. – 1 кастр. – *Пра інаўгурацыю новага навучальнага года ў БУК.*

29. **Беларускае** друкаванае слова ў Францыі (1937–1940) : Le Bulletin de L'assoiation des Belorussesen France / Лора Доўнар // Книга и мы. – 1998. – 21–27 авг. (№ 31). – С. 3. – *Пра дзейнасць беларускай эміграцыйнай асветнай арганізацыі «Хаў-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*рус» у Францыі па старонках яе выданняў, перададзеных Ю. Туронкам і В. Скалабанам у аддзел рэдкай кнігі бібліятэкі БУК.*

30. **БУК**: інаўгурацыя–98 / Л. Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 1998. – 2 кастр. – С. 4. – *Пра інаўгурацыю новага навучальнага года ў БУК.*

31. **Быценскія** кнігі Мікалая Грынчыка / Ларыса Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 1998. – 6 лют. – С. 12. – *Пра кнігазбор М. М. Грынчыка, перададзены ў аддзел рэдкай кнігі бібліятэкі БУК. Змешчаны экслібрыс М. Грынчыка.*

32. **Быць** карыснымі / Ларыса Доўнар // Культура. – 1998. – 21–27 сак. – С. 4. – *Пра ўдзел студэнтаў БУК у рэспубліканскім фестывалі «Мастацтва – дзецям і моладзі».*

33. **«Грамніцам»** – пяць гадоў : [размова з мастацкім кіраўніком ансамбля У. Зяневічам прысвечана новай праграме калектыву і пяцігоддзю яго ўтварэння] / запісала Л. Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 1998. – 20 сак. – С. 2.

34. **Золата** – пароўну! / Л. Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 1998. – 8 мая – С. 14. – *Пра чэмпіёнаў свету па спартыўных танцах на інвалідных калясках – студэнтаў БУК.*

35. **«Італьянскі** сшытак» Уладзіміра Рынкевіча / Ларыса Доўнар // Книга и мы. – 1998. – № 11 (121). – С. 2. – *Пра прэзентацыю ў НББ выставы У. Рынкевіча, мастака, выкладчыка БУК. Прадстаўлены цыкл акварэляў, прысвечаных Італіі.*

36. **«На хвалях** успамінаў» / Л. Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 1998. – 25 снеж. (№ 52). – С. 3. – *Пра вечарыну 16 снежня ў бібліятэцы БУК, прысвечаную 200-годдзю Адама Міцкевіча. Адной з арганізатараў і вядучай была Л. Доўнар.*

37. **Па запаветах** святых Кірылы і Мяфодзія / Лора Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 1998. – 3 ліп. – С. 15. – *Пра IV Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні 1998 г., якія былі арганізаваны сумесна БУК і тэалагічным факультэтам ЕГУ.*

38. **Па запаветах** святых Кірылы і Мяфодзія / Ларыса Доўнар // Бібліятэчны свет. – 1998. – № 4 (9). – С. 20–21. – *Пра Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні 1998 г.*

39. **Пераўвасабленне** і асоба, альбо «Самы невядомы пісьменнік у Беларусі» / Ларыса Доўнар // Наши дети. – 1998. – № 1. – С. 30. – *Пра выхаванне дзяцей у сям'і Доўнараў: Паўла і Іллі. Змешчаны вершык Паўла.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

40. **Першая** мінская кніга-малютка – урокі паслухмянасці і дабрыні / Ларыса Доўнар // Бібліятэчны свет. – 1998. – № 3 (8). – С. 21.

41. **У скарбонку** нашай культуры / Л. Доўнар // Наша слова. – 1998. – 20 траўня. – С. 1 ; 27 чэрв. – С. 1. – *Пра выданне бібліятэкай БУК з 1993 г. серыі бібліяграфічных паказальнікаў «Дзеячы навукі і культуры Беларусі», прысвечанай выдатным вучоным, якія працуюць ва ўніверсітэце культуры, і чарговы паказальнік, прысвечаны Ліліі Дзямешка. Змешчаны яе верш «Цудоўнае слова».*

42. **Храм** «Анёла» / Л. Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 1998. – 3 кастр. – С. 12. – *Пра Духоўны тэатр «Анёл» студэнтаў БУК пад кіраўніцтвам Н. Міцкевіч і іх пастаноўку, прысвечаную памяці заснавальніка Чырвонага касцёла Эдварда Вайніловіча.*

43. **Васіль** Емельянавіч Лявончыкаў : бібліягр. паказ. / БУК, бібліятэка, аддзел рэдкай кнігі ; склад.: Т. А. Дзем'яновіч, **Л. І. Доўнар,** Т. А. Самайлюк ; прадм. В. А. Факеева. – Мінск : БУК, 1998. – 34 с. – (Дзеячы навукі і культуры Беларусі).

44. **Гурый** Іларыёнавіч Барышаў : бібліягр. паказ. / БУК, бібліятэка ; склад.: Т. А. Дзем'яновіч, **Л. І. Доўнар,** І. П. Кажура ; рэд. Т. А. Самайлюк ; прадм. Л. Ф. Голікавай. – Мінск : БУК, 1998. – 80 с. – (Дзеячы навукі і культуры Беларусі).

45. **Лілія** Адамаўна Дзямешка : бібліягр. паказ. / БУК, бібліятэка ; склад.: Т. А. Дзем'яновіч, **Л. І. Доўнар,** І. П. Кажура ; рэд. Т. А. Самайлюк ; прадм. В. Е. Лявончыкава. – Мінск : БУК, 1998. – 31 с. – (Дзеячы навукі і культуры Беларусі).

46. **Юлія** Міхайлаўна Чурко : бібліягр. паказ. / БУК, бібліятэка ; склад.: Т. А. Дзем'яновіч, **Л. І. Доўнар,** Д. Ц. Лявончыкава, Т. А. Самайлюк ; прадм. А. Ладыгінай. – Мінск : БУК, 1998. – 54 с. – (Дзеячы навукі і культуры Беларусі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 1999

47. **Некаторыя** аспекты кніжнай культуры Мінска ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя / Л. І. Доўнар // IV Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы чытанняў (Мінск, 24–25 мая 1998 г.) : у 2 ч. / ЕГУ, БУК ; [рэдкал.: А. У. Пазнякоў (адк. рэд.)]. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1999. – Ч. 2. – С. 91–97.

48. **Адным** словам – «Валачобнікі» / Л. Д. [Доўнар] // Літаратура і мастацтва. – 1999. – 7 мая (№ 18). – С. 10. – *Пра 20-годдзе дзейнасці фальклорнага вакальна-харэаграфічнага ансамбля «Валачобнікі» і да 60-годдзя з дня нараджэння яго кіраўніка Станіслава Дробыша*.

49. «**Знітаваныя** вясной» / Ларыса Доўнар // Культура. – 1999. – 27 сак. (№ 11). – С. 4. – *Пра выставу габеленавых партрэтаў студэнтаў і выкладчыкаў кафедры народных рамёстваў БУК*.

50. **Лёс** – гісторыя: Анатолю Грыцкевічу – 70 / Ларыса Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 1999. – 29 студз. (№ 5). – С. 12. – *Да 70-годдзя А. П. Грыцкевіча, аднаго з самых вядомых беларускіх гісторыкаў, дзейнасць якога з 1975 г. была звязана з універсітэтам культуры*.

51. **На хвалях** успамінаў / Лора Доўнар // Наша слова. – 1999. – 6 студз. (№ 1). – С. 3. – *Пра вечарыну 16 снежня ў бібліятэцы БУК, прысвечаную 200-годдзю Адама Міцкевіча. Змешчаны верш Ірыны Багдановіч «Філамацкая імправізацыя», напісаны ёю на вечарыне. Адной з арганізатараў і вядучай была Л. Доўнар.*

52. **Слаўнай** памяці Ельскіяны / Лора Доўнар // Культура. – 1999. – 18–24 верас. – С. 5. – *Пра кнігазбор Аляксандра Ельскага і праблемы яго рэканструкцыі.*

53. **Сорак** гадоў з кніжнага жыцця Мінска / Ларыса Доўнар // Бібліятэчны свет. – 1999. – № 4 (13). – С. 24–25.

54. **Універсітэты** Ельскіх / Ларыса Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 1999. – 17 верас. – С. 15. – *Праца па падрыхтоўцы канферэнцыі «Універсітэты Ельскіх».*

***Рэдагаванне***

55. **Дзеля** блізкіх і прышласці : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. «Універсітэты Ельскіх» (да 165-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Ельскага), Мінск, 7 кастр. 1999 г. / Беларус. ун-т культуры ; [рэдкал.: Т. А. Дзем'яновіч, Л. І. Доўнар, У. І. Мархель, А. У. Пазнякоў (акд. рэд.), Т. А. Самайлюк ; склад.: **Л. Доўнар**, Т. Дзем'яновіч]. – Мінск : Беларус. ун-т культуры : Ковчег, 1999. – 156 с. : іл. – Рэц.: *А. М.* Дзеля блізкіх і прышласці / А. М. // Літаратура і мастацтва. – 1999. – 15 кастр. – С. 3; *Загорская, М.* Знаковый род Ельских / Марина Загорская // Белорусская деловая газета. – 1999. – 11 окт. (№ 70). – С. 20.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**2000**

56. **Кнігадрукаванне** і кнігавыданне. Пункты дотыку і разыходжання / Л. І. Доўнар // Матэрыялы Першых Кнігазнаўчых чытанняў / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Т.І. Рошчына. – Мінск, 2000. – С. 6–9.

57. **Мінскія** выданні XIX – пачатку XX стагоддзя ў фондах Расійскай нацыянальнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу / Л. І. Доўнар // Перспектыўныя накірункі фарміравання духоўнай і мастацкай культуры студэнтаў : матэрыялы навук. канф. (22–23 крас. 1998 г.) / БУК ; [рэдкал.: А. У. Пазнякоў А.У. (адк. рэд.) і інш.]. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 2000. – С. 68–74.

58. **Рэдкія** мінскія выданні па музыцы XIX ст. / Л. І. Доўнар // Маральна-эстэтычнае выхаванне моладзі сродкамі мастацтва і літаратуры : матэрыялы Міжнар. навук. канф. (24–25 лют. 2000 г.) / БУК ; [рэдкал.: А. У. Пазнякоў (адк. рэд.) і інш.]. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 2000. – С. 167–170.

59. **Благаслаўлёнае** слова / Лора Доўнар // Наша слова. – 2000. – 4 кастр. – С. 3. – *Прэзентацыя кнігі І. Б. Канапацкага і А. І. Смоліка «Гісторыя і культура беларускіх татар» (Мінск, 2000), якая адбылася 19 верасня ў бібліятэцы БУК, адной з арганізатараў і вядучай была Л. Доўнар.*

60. **Даследаванне** старажытных могілак ва ўрочышчы Кобань / Яўген Бондараў, Андрэй Вайцяховіч, **Ларыса Доўнар**, Таццяна Дзем'яновіч, Алег Трусаў // Наша слова. – 2000. – 2 лют. (№ 5). – С. 6. – *Пра даследаванне захавання Ельскіх*.

61. **З дыярыюша** Беларускага ўніверсітэта культуры / Лора Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 2000. – 19 мая. – С. 4. – *Пра святкаванне 25-годдзя БУК*.

62. **Калі** душа нараджаецца крылатай / ул. кар. [Л. Доўнар] // Культура. – 2000. – 30 верас. – 6 кастр. – С. 2. – *Пра інаўгурацыю новага акадэмічнага года ў БУК.*

63. **Лініі** перасячэння, або Яшчэ раз пра «Універсітэты Ельскіх» / Лора Доўнар // Бібліятэчны свет. – 2000. – № 1 (14). – С. 21–23.

64. **Пад** сімвалам «Благо» / Лора Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 2000. – 25 лют. – С. 4. – *Да правядзення VI Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытанняў.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

65. **Успамін** пра Міколу Грынчыка / Лора Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 2000. – 27 кастр. – С. 14. – *Пра вечарыну, прысвечаную памяці былога загадчыка кафедры беларускай мовы і літаратуры, прафесара, доктара філалогіі, заслужанага дзеяча навукі, сябра Саюза пісьменнікаў, удзельніка Другой сусветнай вайны Міколы Грынчыка, якая адбылася ў бібліятэцы БУК 12 кастрычніка.*

## 2001

66. **Кнігавыдавецкія** сувязі Мінска і Вільні ў XIX – пачатку XX ст. / Лора Доўнар // Гісторыя, культуралогія, мастацтвазнаўства : матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый» (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г.) / рэдкал.: В. Скалабан (гал. рэд.). – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2001. – С. 225–233. – (Беларусіка=Albaruthenica ; кн. 21).

67. **Гурый** Барышаў // Літаратура і мастацтва. – 2001. – 22 чэрв. – С. 5.

68. **Рыхтуемся** : VII Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні / Л. Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 2001. – 6 крас. (№ 14). – С. 16.

69. **Бацяеў, В**. Талмуд / Васіль Бацяеў, Ларыса Доўнар // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Беларус. энцыкл. ; [рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.].– Мінск : БелЭн, 2001. – Т. 6, кн. 1. – С. 497. – *Пра выданне Талмуда ў Беларусі – Л. Доўнар.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2002

70. **Кнігавыдавецкія** сувязі Мінска і Варшавы ў канцы XVIII – пачатку XX ст. / Л. І. Доўнар // Матэрыялы Другіх Кнігазнаўчых чытанняў «Кніжная культура Рэчы Паспалітай» (Мінск, 15–16 верас. 2000 г.) / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Т. І. Рошчына. – Мінск : Красіка-Прынт, 2002. – С. 236–243.

71. **VIII** Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, 23–26 мая 2002 г. / [падрыхт. Л. Доўнар] // Літаратура і мастацтва. – 2002. – 26 крас. (№ 17–18). – С. 18.

72. **Бацяеў, В.** Талмуд / Васіль Бацяеў, Ларыса Доўнар // Рэлігія і царква на Беларусі : энцыкл. даведнік / Беларус. энцыкл. ;

[рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2002. – С. 321–322. – *Пра выданне Талмуда ў Беларусі – Л. Доўнар.*

73. **Bibliografia** Białoruska, 1992–1994 / H. Sahanowicz, L. Downar, T. Dziemianowicz, T. Samajluk. – Warszawa : «Przegląd Wschodni», 2002. – 242 s. – (Bibliografia Europy Wschodniej: Polska. Litwa. Białoruś. Ukraina. Rosja ; t. 13).

## 2003

74. **Выданне** рэлігійных кніг у Мінску ў XIX – пачатку XX ст. / Л. І. Доўнар // VIII Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвеч. Дням славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы чытанняў (Мінск, 23–26 мая 2002 г.) / Беларус. дзярж. ун-т культуры ; [рэдкал.: М. А. Бяспалая (адк. рэд.)]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры, 2003. – С. 58–67. – Мінск, 2003. – С. 58–67.

75. **Не спяшайцеся** залічваць да страчанага: мінскія нотныя выданні XIX ст. / Л. Доўнар // Гісторыя выдавецкай дзейнасці ў Польшчы і Беларусі ў XVI – XX стагоддзях : зб. навук. арт. / НАН Беларусі, ЦНБ імя Якуба Коласа ; рэдкал.: Н. Ю. Бярозкіна [і інш.]. – Мінск : Белфранс, 2003. – С. 99–108.

76. **Невядомыя** выданні невядомага габрэйскага выдавецтва «Verlag “Kultur”» у Мінску (1905–1906): старонка суіснавання / Л. Доўнар // Разнастайнасць моў і культур у кантэксце глабалізацыі : матэрыялы Міжнар. сімпозіума (Мінск, 9–10 ліп. 2002 г.) : у 2 кн. / рэдкал.: А. Мальдзіс (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСаЭС «Чарнобыль», 2003. – Кн. 2. – С. 272–280.

77. **Неизвестные** издания неизвестного еврейского издательства Verlag «Kultur» в Минске (1905–1906 гг.) / Лора Довнар // Беларусь у XX стагоддзі. – Мінск, 2003. – Вып. 2. – URL: http://www.homoliber.org/ru/xx/xx020111.html.

78. **Вецер** з Быценя / Л. Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 2003. – 14 лістап. – С. 6.

79. **Грынчыкаў** кнігазбор / Л. Доўнар // Голас Радзімы. – 2003. – 27 студз. (№ 48). – С. 5.

80. **З верай** і думай пра нашчадкаў / Л. Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 2003. – 11 лістап. – С. 8.

81. **Навучальная** кніга для мінчукоў у XIX – пачатку XX ст. / Л. Доўнар // Бібліятэчны свет. – 2003. – № 2. – С. 16–18.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

82. **Не спяшайцеся** лічыць страчаным / Л. Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 2003. – 7 лют. – С. 10–11.

83. **Памятайма**, што ўсё сваё – дарагое / Лора Доўнар // Літаратура і мастацтва. – 2003. – 24 студз. (№ 4). – *Аб выставе ў аддзеле рэдкай кнігі БДУ культуры, якая была арганізавана з кнігазбору М. М. Грынчыка (1923–1999). Публікацыя ўступнага артыкула М. Грынчыка «Моц слова – сіла духу» да бібліяграфічнага паказальніка «Мікалай Міхайлавіч Грынчык» (Мінск, 1993).*

## 2004

84. **«Драбніцы** Ельскіяны» ў сацыякультурнай прасторы (пра электронна-графічны каталог) / Л. Доўнар // Старажытны Тураў: Асвета і Святыні : тэзісы, даклады навук.-асветніцкай канф. (4 верас. 2004 г., г. Тураў) / [уклад.: Н. С. Загорская, Л. Я. Кулажанка]. – Мінск : Юніпак, 2004. – С. 46–49.

85. **Выдавецкая** справа / Л. І. Доўнар // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / Беларус. энцыкл. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2004. – Т. 18, кн. 2 : Рэспубліка Беларусь. – С. 428–436.

## 2005

86. **Развіццё** кнігавыдавецкай дзейнасці ў Мінску (1795–1917): кнігазнаўчы аспект : аўтарэф. дыс. ... канд. пед. навук : 05.25.03 / Л. І. Доўнар ; БДУ культуры і мастацтваў. – Мінск, 2005. – 21 с.

87. **Развіццё** кнігавыдавецкай дзейнасці ў Мінску (1795–1917): кнігазнаўчы аспект : дыс. ... канд. пед. навук : 05.25.03 / Доўнар Ларыса Іосіфаўна. – Мінск, 2005. – 383, [5] л. : табл. – Бібліягр.: л. 100–128 (522 назв.).

88. **Мінская** губернская друкарня (Паводле архіўных матэрыялаў) / Л. І. Доўнар // Матэрыялы Трэціх Міжнар. Кнігазнаўчых чытанняў «Кніга Беларусі: Повязь часоў» (Мінск, 16–17 верас. 2003 г.) / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Т. І. Рошчына. – Мінск, 2005. – С. 189–196.

89. **Издательское** дело / Л. И. Довнар // Республика Беларусь : энцикл. : [в 7 т.] / редкол.: Г. П. Пашков [и др.]. – Минск : БелЭн, 2005. – Т. 1. – С. 877–885.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

90. **Працы** выкладчыкаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (1994–2004) : бібліягр. паказ. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: Т. А. Дзем'яновіч, **Л. І. Доўнар**, І. П. Кажура, Т. А. Самайлюк, А. І. Фядорына. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2005. – 138 с.

***Рэдагаванне***

91. **Республика** Беларусь : энцикл. [В 7 т.]. Т. 1 / редкол.: Г. П. Пашков [и др.] ; [среди науч. консульт. **Л. И. Довнар**]. – Минск : БелЭн, 2005. – 1040 с. : ил.

## 2006

92. **Да пытання** перыядызацыі гісторыі кнігі (на прыкладзе гісторыі кнігавыдання Мінска 1795–1917 гг.) / Л. Доўнар // Wspólnota pamięci. Studia z dziejów ziem wschodnich dawnej Rzeczypospolitej / pod red. J. Gwioździk, J. Malickiego. – Katowice : Biblioteka Śląska, 2006. – S. 97–109. – (Liber amicorum ; vol. 1).

93. **Мінск** 1906–1917 гадоў як шматмоўны кнігавыдавецкі цэнтр, або Што мог чытаць гімназіст Гедройц / Л. Доўнар // На ўшанаванне памяці Ежы Гедройца : матэрыялы Міжнар. навук. канф. «Канцэпцыя УЛБ (Украіна, Літва, Беларусь) – ад ідэі да рэалізацыі» (Мінск, 8–10 чэрв. 2006 г.); выбр. артыкулы з перыядычнага друку / уклад. І. Кулік ; навук. рэд. А. Мальдзіс. – Мінск : Кнігазбор, 2006. – С. 113–121.

94. **Праблемнае** поле беларускай кнігазнаўчай навукі і адукацыі / Л. І. Доўнар // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. : [вып. 1] у 2 ч. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2006. – [Вып. 1], ч. 2. – С. 204–209.

95. **Развіццё** беларускай навукі пра кнігу ў 1920-я гады / Л. І. Доўнар // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. : [вып. 1] у 2 ч. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2006. – [Вып. 1], ч. 2. – С. 114–123.

96. **Тыпалогія** кнігавыдавецкіх сувязей Мінска з Вільняй, Варшавай і Пецярбургам (1795–1917) / Л. Доўнар // Дыяспара. Культуралогія. Гісторыя : матэрыялы IV Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў кантэксце культур еўрапей-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скіх краін» (Мінск, 6–9 чэрв. 2005 г.) / пад рэд. А. Мальдзіса, А. Смаленчука. – Мінск : Рэд. газ. «Голас Радзімы», 2006. – С. 135–139. – (Беларусіка=Albaruthenica ; кн. 28).

97. **Белорусская** типография имени Ф. Скорины / Л. И. Довнар // Республика Беларусь : энцикл. : [в 7 т.] / редкол.: Г. П. Пашков [и др.]. – Минск : БелЭн, 2006. – Т. 2. – С. 288–387.

98. **Белорусский** государственный университет культуры и искусств / Л. И. Довнар // Республика Беларусь : энцикл. : [в 7 т.] / редкол.: Г. П. Пашков [и др.]. – Минск : БелЭн, 2006. – Т. 2. – С. 305.

99. **«Библиотечную** профессию считаю одной из самых лучших»: з рукапіснай спадчыны Я. С. Умецкай / Л. Доўнар // Бібліятэчны свет. – 2006. – № 4. – С. 26–28.

100. **Издательское** дело / Л. И. Довнар // Республика Беларусь : энцикл. : [в 7 т.] / редкол.: Г. П. Пашков [и др.]. – Минск : БелЭн, 2006. – Т. 3. – С. 719–723.

101. **Віленскія** выдавецтвы / Л. Доўнар // Роднае слова. – 2006. – № 8. – С. 94. – (Свята беларускага пісьменства і друку. Слова друкаванае: 1905–1917 гг.).

102. **Выдавецкая** суполка «Загляне сонца і ў наша аконца» / Л. Доўнар // Роднае слова. – 2006. – № 8. – С. 82–83. – (Свята беларускага пісьменства і друку. Слова друкаванае: 1905–1917 гг.).

103. **Выдавецтвы** Антона Грыневіча і «Грамада» / Л. Доўнар // Роднае слова. – 2006. – № 8. – С. 85. – (Свята беларускага пісьменства і друку. Слова друкаванае: 1905–1917 гг.).

104. **Кнігі** Францішка Багушэвіча / Л. Доўнар // Роднае слова. – 2006. – № 8. – С. 78. – (Свята беларускага пісьменства і друку. Слова друкаванае: XIX ст.).

